## § 50. Прыметнікі з суфіксамі ацэнкі, сфера іх ужывання, правапіс

**311.** Прачытайце пары словазлучэнняў. Растлумачце розніцу ў значэннях аднакаранёвых прыметнікаў.

цёплыя рукавіцы — цёпленькія рукавіцы
стара́я хата — старэнькая хата
высокая вежа — высачэнная вежа
доўгі тунэль — даўжэзны тунэль
вялікая вольха — вялізная вольха

Якія суфіксы надаюць значэнню прыметнікаў адценні памяншальнасці, павелічальнасці?

Суфіксы ацэнкі надаюць значэнню прыметнікаў дадатковыя адценні:

- ласкальнасці або памяншальнасці (меншай меры якасці) — суфіксы ***-еньк-, -эньк-, -аньк-, -ават-***: *нов**еньк**і, дараж**эньк**і, свеж**аньк**і, нізк**ават**ы*;
- павелічальнасці (высокай меры якасці) — суфіксы ***-ізн-, -эзн-, -озн-, -енн-, -энн-***: *вял**ізн**ы, глыбач**эзн**ы, выс**озн**ы, здарав**енн**ы, шырач**энн**ы*;
- ласкальнасці і высокай меры якасці — суфіксы ***-утк-, -ютк-, -усеньк-, -юсеньк-***: *ціх**утк**і, бял**ютк**і, ціх**усеньк**і, мал**юсеньк**і*.

Суфіксы ***-еньк-, -эньк-, -аньк-, -усеньк-, -юсеньк-*** пішуцца з мяккім знакам.

**312.** Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары. Абазначце суфіксы ацэнкі прыметнікаў. Якія адценні яны надаюць значэнню прыметнікаў?

1. Гнуткія, тонен..кія, бы бяро..кі, дз..ўчаты вы́сыпалі на сц..нічную пляцоўку *(Л. Адамовіч)*. 2. Пас..рэдзіне вострава расце некалькі в..лізных старых ялін *(В. Вольскі)*. 3. Язычок у вужыка чорнен..кі, вочкі малюсен..кія, як макавінкі, жоўтыя



Правообладатель Национальный институт образования

вушкі — як в..сновы курасл еп *(А. Бароўскі)*. 4. У паветры была страшэнная духата[м] — нібыта збіралася на дождж *(М. Чарот)*.

● Растлумачце правапіс слоў з прыстаўнымі зычнымі.

**313.** Утварыце і запішыце прыметнікі паводле прапанаваных схем. Абазначце суфіксы ацэнкі прыметнікаў.




Якія з утвораных вамі прыметнікаў маюць памяншальна-ласкальныя, павелічальныя адценні значэння?

З двума прыметнікамі з суфіксамі ацэнкі складзіце і запішыце сказы.

Прыметнікі з суфіксамі ацэнкі шырока выкарыстоўваюцца ў мастацкім і гутарковым стылях. Яны выступаюць вобразным сродкам характарыстыкі персанажаў, прадметаў і з'яў.

**314.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып. Якой часткі не хапае ў тэксце?

Джэк — унікальны[л] сабака. Нема..чыма вызначыць яго пароду. Яна нейкая змешаная. Мордачка **вострая**, як у аўчаркі, толькі др..бнейшая, **малая**. Тулава доўга.., а лапкі **кароткія**, як у таксы. **Цёмная** поўсць калматая, як у ёркшырскага тэр'ера. Натура незл..слівая, дружалюбная, як у лабрадора. А **чорныя** вочкі заўсёды **хітрыя**, як у дварняка *(Паводле З. Прыгодзіча)*.



Правообладатель Национальный институт образования

Запішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і замяняючы выдзеленыя прыметнікі аднакаранёвымі прыметнікамі з суфіксамі ацэнкі.

Як паўплывала на змест тэксту замена прыметнікаў?

● Праскланяйце назоўнік *сабака*.

**315.** Складзіце і запішыце невялікі тэкст — апісанне свойскай жывёлы з выкарыстаннем прыметнікаў з суфіксамі ацэнкі.

Націск у прыметніках з суфіксамі ***-еньк-, -эньк-, -аньк-*** па́дае на той склад, што і ў прыметніках, ад якіх яны ўтвораны: *сла́бы* (пад націскам першы склад) — *сла́бенькі*, *малы́* (пад націскам другі склад) — *мале́нькі*, *малады́* (пад націскам трэці склад) — *маладзе́нькі*.

**316.** Запішыце сказы, утвараючы ад прыметнікаў, што ў дужках, прыметнікі з суфіксамі ***-еньк-, -эньк-, -аньк-***.

1. Маці падала мне заклеены *(белы)* канверт *(А. Бароўскі)*. 2. Пасыпаў *(дробны)*, *(густы)* сняжок *(Я. Колас)*. 3. Ля маладзіка скакала *(малая)* зорка, *(вострая)*, як іголачка (*І. Пташнікаў*). 4. *(Нізкая)* паўразбураная хатка за высахлым садам нагадвала сабою пакінутую *(старую)* бабульку *(Л. Адамовіч)*. 5. Варушыся, гэй, не бойся, конік мой *(сівы)*! *(Я. Колас)*.

Пастаўце націск у прыметніках з суфіксамі ацэнкі.

## § 51. Прыметнікі з суфіксам *-ск-*, іх правапіс

**317.** Разгледзьце схемы.

*брат*, *юнак*, *чытач*, *купец* + ск → *брацкі*, *юнацкі*, *чытацкі*, *купецкі*

*сусед*, *француз*, *Нясвіж*, *Добруш* + ск → *суседскі*, *французскі*, *нясвіжскі*, *добрушскі*

Якой літарай (літарамі) у прыметніках, утвораных пры дапамозе суфікса ***-ск-***, передаюцца спалучэнні зычных на стыку марфем: а) ***тс, кс, чс, цс***; б) ***дс, зс, жс, шс***?



Правообладатель Национальный институт образования